першапачатковую, або прыму, ракаход (тоны ідуць у адваротным парадку), інверсію (інтэрвалы серыі дадзены ў абярненні), ракаходную інверсію. Кожная форма можа быць пачата з любога з 12 тонаў тэмпераванай сістэмы, у выніку атрымліваецца 48 раўназначных серыйных радоў. Серыя можа выкладацца гарызантальна, утвараючы меладычную лінію, вертыкальна, утвараючы акордыку, або ў розных камбінацыях рухаў. Д. — метад поліфанічны ў сваёй сутнасці, паколькі абапіраецца на агульны кантрапунктычны прынцып перманентнага правядзення серыйных радоў адзін адразу з другім, г.зн. адзінакалейна (праводзіцца адзіны рад), 2-, 3- і чатырохкалейна (праводзіцца адразу некалькі радоў). Эстэтычны сэнс выкарыстання Д — дасягненне канструкцыйнага адзінства і лагічнай звязнасці гукаў (тонаў, акордаў) пры адсутнасці класічных танальных адносін. Да Д. звяртаюцца многія сучасныя бел. кампазітары, часцей фрагментарна ў рамках танальна арганізаванай музыкі (В.Воранаў, В.Войцік, Г.Гарэлава, А.Гураў, У.Дарохін, В.Капыцько, С.Картэс, В.Кузняцоў, А.Літвіноўскі, Д.Лыбін, А.Мдывані, Д.Смольскі, А.Сонін, Р.Сурус і інш.).

*Т.Г.Мдывані.*

**ДАДЭРКА**, Д з я д з е р к а Якуб Ігнацы (1751—1829), першы мінскі рымска-каталіцкі епіскап (біскуп). Прозвішча паходзіць ад назвы родавага маёнтка Дадэркалы (Валынь). Нарадзіўся ў Вількамірскім павеце. Пасля навучання ў Віленскай акадэміі ўступіў у ордэн езуітаў. У 1776 пасвячоны ў ксяндзы. Канонік Віленскай катэдры (1781), дэпутат літоўскага духоўнага трыбунала (1783, 1786, 1788, 1791), інфулят Алыцкі (1789). Першы біскуп Мінскай дыяцэзіі (1798—1816). У 1810 засн. у Мінску Т-ва дабрачыннасці, распачаў будаўніцтва дома для бяздомных, сірот, жабракоў і невылечнахворых. У 1812 прыняў удзел ва урачыстым адкрыцці Полацкай езуіцкай акадэміі. Прыхільнасць Д. да Напалеона І у час вайны 1812, прадузятасць у адносінах да праваслаўнай царквы выклікалі гнеў рас. імператара Аляксандра І, які передаў Д. на суд мітрапаліта С.І.*Богуш-Сестранцэвіча.* 16.5.1816 Д. быў пазбаўлены пасады і адпраўлены з Мінска на Валынь пад нагляд луцкага біскупа.

**ДАЁНКА**, бандарная пасудзіна на 6—10 л, крыху расшыраная ў верхняй частцы. Выкарыстоўвалася для даення кароў. Рабілі Д. з хваёвых, радзей з дубовых ці кляновых клёпак. Адна падоўжаная клёпка ўтварала ручку, у клёпцы насупраць рабілі літок (рыльца). Для даення кароў у полі выкарыстоўвалі Д. з почапкай.

**ДАЖБОГ**, ва ўсходнеславянскай міфалогіі бог Сонца. Сутнасць Д. да канца не зразумелая, як і паходжанне самой назвы. З «Аповесці мінулых гадоў» вядома, што ў Кіеве (каля 980) на пагорку сярод выяў язычніцкіх багоў стаяў ідал Д. («постави кумиры... Перуна... Хърса Дажьбога, и Стрибога, и Симарьгла, и Мокошь»). У Іпацьеўскім летапісе пад 1114 ва ўстаўцы ўрыўка з «Хронікі Іаана Малалы» паведамляецца, што разам са Сварогам быў Д.: «И по семь царствова сынь его, именемь Солнце, его же наричють Дажьбогь... Солнце царь сынь Свароговь, еже Дажьбогь... не хотя отца своего закона разсыпати Сварожа...» З гэтага вынікае, што Д. з'яўляўся богам Сонца і лічыўся сынам Сварога. Летапісец вылучае ў другой перыядызацыі язычніцтва яго 3-ю стадыю, эру Д., калі з'явілася класавае грамадства і людзі пачалі плаціць даніну князям. У «*Слове аб палку Ігаравым*» Дажбогавымі ўнукамі называюцца ўсх. славяне, якія загінулі ў барацьбе з полаўцамі: «Вьстала обида вь силаь Дажьбожа внука...» Іх родапачынальнікам і заступнікам лічыцца Д. Абрад беларусаў «*Жаніцьба коміна*» ўтрымлівае рэшткі язычніцкіх уяўленняў аб агні «сварожычы», які жыў у сушні, на печы і пад ёй, у коміне. Пра пакланенне агню ўсх. славянамі сведчаць царк. павучанні: «Огневи молять же ся, зовуще его сварожичем». Беларусы верылі ў тое, што ў час Каляд уладар падземнага царства Карачун і бог зімы Зюзя змагаліся з Перуном. Яны прадчувалі, што народзіцца Божыч і хацелі яго знішчыць. Дзеля гэтага Зюзя пературарыўся ў мядзведзя, сабраў воўчую зграю (мяцеліцу) і разам яны ганяліся за жонкай Перуна. Грамаўніца (Каляда) схавалася ад іх у вербалозах і нарадзіла Д. У гэтай легендзе адбіліся сляды міфалагічнага мыслення стараж. чалавека аб касмічнай з'яве — зімовым сонцавароце. На Лагойшчыне, каля вёскі Крамянец ляжыць камень, да якога людзі ставяцца з павагай, прыносяць кветкі, манеты, хусткі, хлеб, тканіну, ягады. Яго называюць «Богаў камень», «Святы», «Дажбог». Людзі вераць, што ён валодае цудадзейнай, гаючай сілай, просяць пасласць дождж, вылечыць ад хваробы і інш.

*Літ.*: Л я ў к о ў А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. Мінск, 1992; Л і ц ь в і н к а В. Святы і абрады беларусаў. Мінск, 1997.

*А.М.Аляхновіч.*

**ДАЖЫНКАВЫЯ ПЕ́СНІ**, «д а ж о н», «а б ж ы н к і», выконваліся на апошняй стадыі завяршэння жніва, якая называлася «Завіванне барады». Жніўная талака пакідала на полі 20—30 каласкоў, вакол якіх спявала: «Павейце, ветры, // Рана, рана, // Па чыстым полю // Нясіце весці // Нашаму пану, // Што яго жнейкі // Жыта пажалі, // У копы паклалі. // Ой, часта, густа // На небе звёзды, // Ой, часцей, гусцей // На полі копы. // Ой, шырок, высок // На небе месяц, // Ой, шыры, вышы // Ля гумна скірта». У гэтых песнях сродкамі метафары адлюстроўвалася цяжкая праца на жніве («У нас сягоння вайна была, усё поле зваявалі», «Чыё гэта поле зазвінела скора, зазвінела скора?»). Значнае месца сярод Д.п. займаюць творы, прысвечаныя ўслаўленню гаспадара і гаспадыні за іх дбайнасць, гаспадарлівасць, павагу да жнеек. Іх узвелічэнне адбываецца іншасказальна — праз багаты ўраджай, які сабра-

ла дажынкавая талака, і добрую гаспадарку («А чы поўна арэхавая чаша ядром налітая? А чы поўна гаспадара гумно, дабром навядзёна?», «Расхадзіся, наша гаспадынька, перад жнейкамі, кажы выносіць цясовыя сталы на чыстыя двары»). У часы прыгону ў Д.п. высмейвалася сквапнасць гаспадароў, выказвалася абурэнне прымусам да працы на жніве з боку прыганятых. У многіх творах сустракаліся матывы сац. незадаволенасці тагачасным сямейным і грамадскім жыццём жанчыны. Некаторыя Д.п. пранізаны міфалагічнымі і анімістычнымі ўяўленнямі («Ой, хадзіў Раю», «Хадзіў Спарыш па вуліцы»). Асобную групу складаюць Д.п., у якіх хрысціянскія святыя ўвасоблены, як звычайныя сяляне: «Сам Бог жыта зажаў, // Ілья снапы вязаў, // А святы Барыс у копы клаў». Пэўнае месца ў Д.п. займалі дажынкавы вянок і апошні сноп, што сімвалізавалі вобраз багатага ўраджаю. Яны надзяляліся рысамі жывых істот («Каціўся вяночак па полю, прасіў жэнчыкаў дадому»). Завяршальнымі сярод дажынкавых лічацца застольныя песні, якія адрозніваюцца весялосцю, гарэзлівасцю, гумарам. У наш час існаванне Д.п. магчыма толькі ва ўмовах фалькларызму, паколькі працэс с.-г. вытворчасці выключае працу жняі.

*Літ.*: Жніўныя песні. Мінск, 1974; Ліс А.С. Жніўныя песні. Мінск, 1993.

*А.М.Аляхновіч.*



*Абрад **«Дажынкі»** ў выкананні гурта «Баярачка» з в. Ляўкі Любанскага раёна. 2012.*

**ДАЖЫНКІ**, старадаўні абрад, прысвечаны заканчэнню жніва. У апошні дзень працы збіралася талака з жанчын, якая ў канцы поля пакідала жыта (прыкладна 20 каласкоў). Адна са жней палола між іх траву і клала на гэтае месца хлеб і соль, якія сімвалізавалі ахвяру духам нівы. Спяваючы, дзяўчаты сплялі вянок з каласкоў і палявых кветак. Астатнія жнеі паралельна здзяйснялі абрад «*Завіванне барады*». Выпалаўшы «бараду», пальніца падразала звязаны зверху саломінай «куст» і кідала серп праз галаву ў процілеглы бок ад жней. Затым качалася па ніве, прыгаворваючы: «Ніўка, ніўка, аддай маю сілку на другую ніўку. На коніка лой, на ніўку гной, а мне здароўя. Судзі, божа, на лета жаці і ядранейшае і гусцейшае».

Як сведчаць некаторыя этнографы, сноп ставілі на покуці, або клалі асобна ў гумне да часу сяўбы азімых, а затым выбітыя з яго зярняты рассявалі па полі. На Гродзеншчыне «бараду», нязжатыя каласы, пакідалі для птушак, дзякуючы за тое, што яны разнеслі зерне па зямлі. Некаторыя вучоныя бачылі ў гэтым абрадзе «імітацыю, магічнае сеянне хлеба на будучы год», іншыя — ахвярапрынашэнне «духу нівы». Ёсць меркаванне, што сваю назву абрад «Завіванне барады» атрымаў на Віцебшчыне, дзе жнеі, прапалоўшы «куст», завівалі яго справа налева.

Сплецены вянок адзявалі на галаву адной з лепшых жней, у сярэдзіну апошняга дажынкавага снапа клалі зжатую «бараду» і з песнямі ішлі ў двор гаспадара, які з гаспадыняй сустракаў жней хлебам-соллю. Старшая між жней («багіня») з паклонам клала ля ног гаспадара дажыначны сноп, які гаспадыня акрапляла «святой» вадою, вянок перадавала яму ў рукі, прыгаворваючы: «Пазлароў, Божа, гаспадару! Прыняслі табе вянок з шырокага поля, з ядранага жыта. Гаспадар свайго гаспадарства не страціць, нам за вянок заплаціць, хоць чырвоныя боты для нашай ахвоты — жыту на ўраджай, гаспадару на доўгі век». Заканчваліся Д. частаваннем жней. Абрадавы характар Д. меў прадаўжэнне ў стравах, якія павінны былі спрыяць усходам збажыны, асабліва густая каша, бліны (Лепельшчына), масла, мяса, сыта, гарэлка. Сёння Д. атрымалі дзярж. статус,ператварыліся ў вял. нар. свята.

*Літ.*: Гл. да арт. Дажынкавыя песні.

*А.М.Аляхновіч.*

**ДАЙДЖЭСТ** (ад англ. digest агляд, кароткі пераказ), 1) тып часопіса, які перадрукоўвае з інш. выданняў матэрыялы ў скарочаным і звычайна адаптаваным для чытачоў выглядзе. 2) Масавае выданне, якое ўтрымлівае скарочаны пераказ папулярных твораў маст. л-ры.

**ДАЙНЕ́КА** Леанід Мартынавіч (н. 28.1.1940, в. Змітраўка Клічаўскага р-на), беларускі пісьменнік. Скончыў БДУ (1967). Працаваў на тэлебачанні. З 1972 у час. «Маладосць», у 1989—91 у выд-ве «Мастацкая літаратура». Аўтар зб-каў паэзіі «Галасы» (1969), «Бераг чакання» (1972), «Начныя тэлеграмы» (1974), «Мая вясна саракавая» (1979), «Вечнае імгненне» (1985), «Сняжынкі над агнём» (1989), апавяданняў «Бацькава крыніца» (1976), у якіх роздум пра вайну, маленства, жыццё вёскі, услаўленне роднай зямлі і чалавека працы. Падзеі мінулага асэнсоўваюцца ў дылогіі «Людзі і маланкі» (1978) і «Запомнім сябе маладымі» (1981), раманах